# Палажэнне аб выкарыстанні і мадэрацыі публічнай рассылкі Нацыянальнай платформы ФГС УП

Прынята за аснову Канферэнцыяй БНП 4 лістапада 2013 года

Інфармацыйная рассылка Нацыянальнай платформы Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства з'яўляецца рабочым інструментам, які дазваляе ўдзельнікам абменьвацца інфармацыяй, арганізоўвацца і самаарганізоўвацца з тым, каб больш эфектыўна дзейнічаць для дасягнення мэтаў і задач Нацыянальнай платформы, Форума грамадзянскай супольнасці і Усходняга партнёрства.

У сувязі з гэтым неабходна ўсведамляць, што эфектыўнасць дадзенай працоўнай прылады павінна з'яўляцца адным з прыярытэтаў яго стваральнікаў і ўдзельнікаў - бакоў , зацікаўленых у дасягненні мэтаў і задач Нацплатформы , Форума іУсходняга партнёрства.

У сувязі з гэтым,

**<u>Удзельнікам публічнай рассылкі НП</u>**

можа стаць любая арганізацыя, якая атрымала статус сталага ўдзельніка Нацыянальнай платформы. Колькасць адрасоў, якія ад арганізацыі могуць быць падпісаны на рассылку - неабмежаваная. Каардынацыйны камітэт Нацыянальнай платформы ў такім выпадку абавязаны забяспечыць доступ да рассылкі для дадзенай арганізацыі,

Удзельнікам публічнай рассылкі НП можа таксама стаць арганізацыя, якая не мае статусу сталага ўдзельніка НП. У такім выпадку арганізацыя павінна звярнуцца ў Каардынацыйны камітэт з адпаведным запытам. КК мае права адмовіць арганізацыі-неўдзельніку Нацыянальнай платформы ў падпісцы на публічную рассылку.

Адказнасць за арганізацыю і кіраванне публічнай рассылкай Нацыянальнай платформы нясе Каардынацыйны камітэт,

**<u>Дапушчальнай лічыцца інфармацыя , якая</u>**

А) Спрыяе дасягненню мэтаў і задач Нацплатформы , ФГС Усходняга партнёрства і самога Усходняга партнёрства;

Б) Змяшчае ў сабе запрашэнне / прапанову / заклік да сумеснай дзейнасці , накіраванай на дасягненне мэтаў і задач Нацплатформы , ФГС Усходняга партнёрства і самога Усходняга партнёрства;

В) Асвятляе падзеі, што адбываюцца ў Нацплатформе, ФГС Усходняга партнёрства, Усходнім партнёрстве, дае аб'ектыўную і карысную інфармацыю пра агульную сітуацыю і працэсы, што адбываюцца .

Г) Забяспечвае канструктыўную і змястоўную дыскусію удзельнікаў рассылкі па важных для парадку дня Нацыянальнай платформы пытаннях.

**<u>Дапушчальнымі лічацца каментары, якія</u>**

А) Непасрэдна датычацца тэмы першапачатковага паведамлення;

Б) Дапаўняюць першапачатковае паведамленне новымі карыснымі звесткамі;

В) Выказваюць пункт гледжання арганізацыі (або яе прадстаўніка ) - сталага ўдзельніка Нацплатформы на выкладзенае паведамленне і асвечаныя ў ім падзе, працэсы.

**<u>Як у паведамленнях , так і ў каментарах , катэгарычна не дапускаюцца:</u>**

А) Любыя асобасныя ацэнкі замест ацэнак поглядаў і пазіцый, што выказваюцца ў рассылцы

Б) Абразы, абвінавачванні ў адрас удзельнікаў рассылкі і трэціх асобаў,

В) Выступы, якія носяць дыскрымінацыйны характар па прыкмеце полу, нацыянальнасці і любой іншай прыкмеце;

Б) Паведамленні і каментаванне на адцягненыя тэмы - тое, што ў інтэрнэце завецца «флудам».

**<u>Аб мадэрацыі</u>**

Мадэратар вызначаецца і зацвярджаецца Каардынацыйным камітэтам. Пры гэтым персона мадэратара застаецца ананімнай. Адказнасць за дзеянні мадэратара перад Нацыянальнай платформай нясе Каардынацыйны камітэт. У выпадку, калі дзеянні мадэратара кімсьці палічаныя некарэктнымі, ён у праве падаць скаргу ў Каардынацыйны камітэт, які можа адмяніць рашэнне мадэратара.

Мадэратар сочыць за тым, каб паведамленні і далейшая перапіска (каментаванне) не парушалі прыведзеныя вышэй прынцыпы працоўнага выкарыстання публічнай рассылкі Нацыянальнай платформы.

У выпадку аднаразовага парушэння прыведзеных у дадзеным Палажэнні правілаў мадэратар абвяшчае парушальніку папярэджанне.

У выпадку трохразовага парушэння правілаў дадзенага Палажэння парушальнік пазбаўляецца магчымасці публікаваць свае каментары ў межах рассылкі БНП тэрмінам на адзін месяц.

Пасля трохразовага ўжывання санкцый у выглядзе часовага пазбаўлення права каментавання, такі суб'ект можа быць адключаны ад рассылкі па рашэнні Каардынацыйнага камітэта БНП на падставе інфармацыі, атрыманай ад мадэратара.

Пры гэтым такое адключэнне не ўплывае на статус і становішча суб'екта ў самой Нацыянальнай платформе.

Каардынацыйны камітэт мае права адмяніць рашэнне аб адключэнні парушальніка ад рассылкі, але не раней, чым праз тры месяцы пасля прыняцця гэтага рашэння.